Аддзел адукацыі, спорту і турызму
Смаргонскага райвыканкама
**ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ “СЯРЭДНЯЯ ШКОЛА № 2 г.СМАРГОНІ”**
вул. Леніна, 33, 231042,
г.Смаргонь, Гродзенская вобласць
Тэл/факс (01592) 4 68 10
эл. пошта: sch2-smorgon@mail.grodno.by

Отдел образования, спорта и туризма
Сморгонского райисполкома
**ГОСУДАРСТВЕННОЕ УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ «СРЕДНЯЯ ШКОЛА № 2 г. СМОРГОНИ»**
ул. Ленина, 33, 231042,
г.Сморгонь, Гродненская область
Тел/факс (01592) 4 68 10
эл. почта: sch2-smorgon@mail.grodno.by

__31.05.2016____№ 04-04/1/83
На № __________ад____________

Методисту по библиотечным фондам
Черник Т.А.

Аналіз работы інфармацыйна-бібліятэчнага цэнтра дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа №2 г.Смаргоні” за 2015/2016 навучальны год

Работа інфармацыйна-бібліятэчнага центра (далей – ІБЦ) накіравана на прапаганду інфармацыйнай культуры сярод навучэнцаў, прывіццё навыкаў умелага карыстання кнігай і электроннымі дакументамі. Тут назапашваюцца і сістэматызуюцца ўсе віды інфармацыі: кнігі, часопісы, відэасродкі, інтэрнэт-рэсурсы, відэаролікі. У ІБЦ налічваецца 3 камп’ютары, на якіх маецца доступ да Інтэрнэт-сеткі. Для паслуг наведвальнікаў прапаноўваюцца розныя сайты для аказання метадычнай дапамогі настаўнікам, а таксама для адукацыйнага працэсу і самаадукацыі настаўнікаў і школьнікаў. Навучэнцы маюць магчымасць дадатковай падрыхтоўкі да ўрокаў, пазакласных мерапрыемстваў, інфармацыйнай гадзіне па сродках Інтэрнэту. Бібліятэкар садзейнічала паспяховаму засваенню навучальных праграм, развіццю творчага мыслення, пазнавальных інтарэсаў і здольнасцяў вучняў праз ўкараненне ў работу сучасных бібліятэчных методык, актыўнае выкарыстанне фонду бібліятэкі, аказвала кансультацыйную дапамогу вучням, педагагічным работнікам і іншым катэгорыям карыстальнікаў у атрыманні інфармацыі.;

У ІБЦ за 2015/2016 навучальны год сабраны комплекс адукацыйных і інфармацыйных матэрыялаў на электронных і папяровых носьбітах, да якіх забяспечаны доступ навучэнцаў і педагогаў:

- электронныя падручнікі;
- вучэбна-метадычныя дапаможнікі, інструктыўна-метадычныя пісьмы, праграмы;
- перыядычныя выданні і электронныя дадаткі да іх;
- электронныя сродкі навучання да вучэбных прадметаў, дапаможны матэрыял, распрацаваны педагогамі ўстановы адукацыі;

- прэзентацыі, віктарыны, крыжаванкі для настаўнікаў і навучэнцаў пачатковых класаў па літаратурнаму чытанню, чалавек і свет, факультатыўным заняткам;

- прэзентацыі, літаратурныя і класныя гадзіны, інтэлектуальныя гульні для навучэнцаў і настаўнікаў беларускай і рускай мовы і літаратуры;

- распрацоўкі выхаваўчых мерапрыемстваў для класных гадзін, для работы шостага школьнага дня;

Доступ да інфармацыі, якая змяшчаецца ў ІБЦ ажыццяўляецца з усіх камп'ютараў па лакальнай вылічальнай сетцы.

За 2015/2016 навучальны год у ІБЦ склаліся наступныя паказчыкі:

На 31 мая 2016 года кніжны фонд ІБЦ складае:

| Назва | Колькасць | Сума |
|---|---|---|
| Метадычная і мастацкая літаратура | 8774 | 24334274,7 |
| Падручнікі | 5082 | 66888284,76 |
| Электронныя сродкі | 29 | 8201546= |

Штогод папаўняецца фонд ІБЦ:

| Назва | Колькасць | Сума |
|---|---|---|
| Спонсарская дапамога | - | - |
| Метадычная і мастацкая літаратура | 123 | 3298635 |
| Сацыяльна-значымая літаратура | - | - |
| Падарунак | - | - |

Паказчыкі:

| | |
|---|---|
| Чытачы | 301 |
| Вучняў | 256 |
| Настаўнікаў | 32 |
| Іншыя | 13 |
| Кнігавыдача | 5782 |

| | |
|---|---|
| Чытальнасць | 19,2 |
| Наведвальнасць | 21,2 |
| Абарачальнасць | 0,7 |

Работа с праграмай «Бібліёграф»:

| | |
|---|---|
| Падручнікі | 100% |
| Метадычная і мастацкая літаратура | 94% |
| Картатэкі | 100% |

На пачатку кожнага навучальнага года складаецца план работы ІБЦ на год, у якім адлюстроўваюцца асноўныя напрамкі работы: арганізацыя бібліятэчнага фонду, праца з фондам, даведачна-бібліяграфічная работа, інфармацыйная праца, узаемадзеянне з іншымі бібліятэкамі і інфармацыйна-бібліятэчнымі цэнтрамі раёна і горада, змест работы з навучэнцамі I-XI класаў. План работы ІБЦ складаецца ў адпаведнасці з гадавым планам выхаваўчай работы школы. У адпаведнасці з тэматычным планаваннем на год з мэтай павелічэння колькасці чытачоў у ІБЦ і фарміравання ў школьнікаў інфармацыйнай культуры, культуры чытання, праводзяцца выхаваўчыя мерапрыемствы: кніжныя паліцы і выставы, гутаркі-віктарыны, слайд-гутаркі, кніжныя і літаратурныя вечарыны.

Забяспечанасць навучэнцаў падручнікамі ў 2015/2016 навучальным годзе складае 100%. З мэтай беражлівых адносін да кнігі і захаванасці фонду 1 раз у чвэрць праводзіўся рэйд па захаванасці падручнікаў. Вынікі праверак даводзяцца да ведама навучэнцаў на класных гадзінах. Таксама праводзіліся гутаркі з дзецьмі і класнымі кіраўнікамі па захаванасці падручнікаў. З актывам бібліятэкі і навучэнцамі пачатковых класаў праводзілася акцыя “Помоги нам – мы отблагодарим”, “Книги просят о помощи”.

На працягу года вялася работа па спісанню падручнікаў і мастацкай літаратуры:

- па прычыне разавага выкарыстання - 210 экзэмпляраў на суму 998041 бел.руб.
- не праходзяць па зборніку нарматыўных дакументаў –820 экзэмпляраў на суму 3038109,8 бел.руб.
- падарунак прэзідэнта РБ - 35 экзэмпляаўы на суму 890748 бел.руб.

З мэтай прывіцця любові да кнігі, да творчасці пісьменнікаў, пісьменнікаў-юбіляраў з навучэнцамі I-XI класаў праводзіліся:

- кніжныя выставы “Не жалею, не зову, не плачу” (да 120-годдзя С.Есеніна), “Жывая гісторыя Беларусі“ (да 85-годдзя Ул.Караткевіча),

“Палесская хроніка” (да 95-годдзя І.Мележа), да 95-годдзя І. Шамякіна, “Поэзия доброты” (да 110-годдзя А.Барто), “Пякучка Крапіва” (да 120-годдзя К.Крапівы);

- выстава-апытванне “За што я люблю бібліятэку”, выстава “Паўночныя Афіны” (да 250-годдзя М.К.Агінскага), ролевая гульня “Калі б я быў настаўнікам”, слайд-гутарка “Профессия – учитель”, слайд-гутарка “”Хочу – курю! Имею право?», гутарка «ВИЧ – избирательный убийца», выстава «Правда о СПИДе», стихотерапия “Наша Таня громко плачет”, віктарына гульня “Таямніцы беларускіх слоў”, “Сонца Вам і кветак, дарагія матулі”, “Пакуль Чарнобыль у душу глядзіць”, “Каго забіла кропля нікаціну”

- прэзентацыі «Их именами названы улицы города”, «Что за прелесть эти сказки», «Поэзия доброты», «Все витамины в гости к нам».

У шосты школьны дзень праводзіліся наступныя мерапрыемствы: слад-гутарка “Профессия – учитель” (5-8 кл.), гутарка “Если был бы я учитель” (1-4 кл.), да Дня гісторыі роднага краю фота, відэа, малюнкі аб родным горадзе, прэзентацыя «Их именами названы улицы», да 110-годдзя А.Барто стихотерапия “Наша Таня громко плачет“ (1-4 кл.), да сусветнага Дня здароўя гульня-віктарына “Вкусные и полезные секреты здоровья” (1-4 кл.), конкурсная праграма «Модно быть здоровым» (5-8 кл.), да Дня Перамогі кніжная выстава “Этих дней не смолкает слава” (1-4 кл.), паэтычная кампазіцыя «Войны священные страницы навеки в памяти людской”.

З мэтай развіцця цікавасці да кніг, казак, пазнавальнай літаратуры быў праведзены Тыдзень дзіцячай і юнацкай кнігі па асобнаму плану. Былі праведзены: “День юных интеллектуалов”, конкурс «Их мы знаем по сказке, а по какой?», «Узнай, кто говорит?», «Сказочно-волшебная викторина для самых внимательных читателей», час общения «Загадай – мы отгадаем», игра-викторина «Детективное агентство «Поиск»». Пры падвядзенні вынікаў самыя актыўныя ўдзельнікі ўзнагароджаны граматамі и падзячнымі лістамі.

Асаблівая ўвага ўдзялялася навучэнцам IX і XI класаў у сувязі з выбарам прафесіі. На працягу навучальнага года праводзіліся гадзіны зносін “РТ – уверенный старт к успеху на ЦТ”, гульня “Мир профессий” “Путь к профессии”, «Профессии наших родителей», «Профессии, которые мы выбираем».

Уся работа ІБЦ праводзілася сумесна з педагагічным калектывам: падбіраўся матэрыял да класных гадзін, да адкрытых урокаў і мерапрыемстваў, да метадычных аб’яднанняў, да творчых груп, да выхаваўчых мерапрыемстваў.

Своечасова праводзілася сярод калектыва індывідуальная і ведамасная падпіска на газеты і часопісы Рэспублікі Беларусь.

У новым навучальным годзе неабходна прадоўжыць абнаўляць выставы і тэматычныя полкі, працаваць над камплектацыяй ІБЦ сацыяльна-значымай літаратуры, весці мэтанакіраваную работу ў праграме “Бібліеграф”.

Дырэктар школы А.Э.Апанасовіч